КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ

# ПЛАТФОРМА 2025

[ Канферэнцыя Новая Беларусь 03-04 Жніўня 2024 ]

Мы, беларусы і беларускі – еўрапейскі народ, які мае права на свабоду і справядлівасць. У 2020 годзе мы прадэманстравалі сваю годнасць, і маем яе дагэтуль. Мы вартыя і імкнемся да лепшай будучыні ў Беларусі.

Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычнай супольнасці, дэманструем сваю еднасць па наступных палажэннях:

- Аляксандр Лукашэнка злачынна ўтрымлівае ўладу, абапіраючыся на рэпрэсіі і падтрымку Крамля. Ні ён, ні падкантрольныя яму органы ***не маюць легітымнасці для прызначэння і правядзення выбараў.***
- ***Электаральная кампанія 2025 года – гэта імітацыя выбараў.*** З-за татальных рэпрэсіяў беларусы і беларускі не змогуць убачыць дэмакратычных кандыдатаў і кандыдатак у бюлетэнях, паўдзельнічаць у мітынгах і агітацыйнай кампаніі. Гэта ***яшчэ далей ад свабодных і дэмакратычных выбараў, чым калі-небудзь раней у Беларусі.***
- ***Мы падтрымліваем*** дзейнасць інстытутаў дэмакратычных сілаў Беларусі – Святланы Ціханоўскай, Аб'яднанага Пераходнага Кабінета, Каардынацыйнай Рады, а таксама дзейнасць партыяў, арганізацыяў і ініцыятываў, якія працягваюць барацьбу за дэмакратычныя змены ў Беларусі.
- ***Мы патрабуем:*** спынення ўсіх відаў рэпрэсіяў, вызвалення палітзняволеных, рэалізацыі права ўсіх грамадзянаў Беларусі на паўнавартасны ўдзел у выбарах незалежна ад месца жыхарства, забеспячэння свабоды сходаў і роўнага доступу да СМІ, а таксама правядзення выбараў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі АБСЕ і пад кантролем назіральнікаў.
- ***Мы дзейнічаем:*** арганізуем сумесныя грамадска-палітычныя дзеянні, вынікам якіх стане непрызнанне беларускай і міжнароднай супольнасцю вынікаў імітацыі выбараў.

Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычнай супольнасці Беларусі, падзяляем наступныя **МЭТЫ ПЛАТФОРМЫ 2025,** і будзем сумесна дзейнічаць для іх дасягнення:

- ***Не дапусціць легітымацыі*** рэжыму Лукашэнкі ў вачах беларускай і міжнароднай супольнасці.
- ***Быць еднымі дзеля Беларусі.*** Нашыя агульныя ворагі – недэмакратычныя рэжымы Лукашэнкі і Пуціна. Мы будзем аб'ядноўвацца для супольнай дзейнасці, а не змагацца адно супраць аднаго.
- ***Дамагацца адкрытасці Еўропы*** і ўсяго дэмакратычнага свету для беларусаў і беларусак, выразна адрозніваць нас ад рэжыму. Не жалезнай заслоне!
- ***Прасоўваць павестку пераменаў***, якія выведуць краіну з ізаляцыі, вайны і крызісу – у годную будучыню.

- *Фарміраваць разнастайны інфармацыйны ландшафт*, заснаваны на дэмакратычных каштоўнасцях, які з'яўляецца неабходным для супрацьдзеяння прапагандзе і дэзынфармацыі рэжыму.
- *Садзейнічаць расколу элітаў для дэмакратычнага транзіту.* Мы адкрытыя да дыялогу з дзяржаўнымі служачымі, якія выступаюць за незалежную і дэмакратычную Беларусь.

Для дасягнення гэтых мэтаў мы ставім перад сабой наступныя **ЗАДАЧЫ ПЛАТФОРМЫ 2025:**

- *Аб'яднаць усе намаганні па вызваленню палітвязняў* і спыненню рэпрэсіяў у Беларусі, выкарыстоўваючы ўсе неабходныя інструменты: санкцыйны і дыпламатычны ціск на рэжым, працу па гуманітарным спісе і гуманітарныя перамовы;
- *Дамагацца дэлегітымацыі рэжыму дыпламатычнымі дзеяннямі.* Кансалідаваць намаганні з іншымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі, а таксама парламенцкай супольнасцю праз альянс дэпутацкіх групаў «За дэмакратычную Беларусь»;
- *Дамагацца прыцягнення да адказнасці* Лукашэнкі і яго паплечнікаў за злачынствы супраць беларускага народа і міжнародныя злачынствы;
- *Напоўніць зместам еўрапейскую перспектыву для Беларусі,* зрабіць еўрапейскі выбар адчувальным, а яго канкрэтныя перавагі – зразумелымі для ўсіх беларусаў і беларусак;
- *Абараняць і прасоўваць інтарэсы* беларусаў і беларусак, дзе б яны ні знаходзіліся. Адвакатаваць пытанні выдачы візаў і адкрыцця пасажырскіх пераходаў, доступу да атрымання адукацыі, вырашэння пытанняў легалізацыі;
- *Умацоўваць сувязі* паміж беларусамі і беларускамі з рознымі поглядамі, унутры краіны і за яе межамі, праз сумесныя дзеянні, узмацняць патэнцыял беларускіх арганізацыяў;
- *Пашыраць аўдыторыю,* супрацьстаяць прапагандзе і распаўсюджваць праўдзівую інфармацыю пра падзеі ў Беларусі;
- *Прыцягваць моладзь* да актыўнага ўдзелу ў палітычных працэсах і абмеркаванні шляхоў развіцця будучыні Беларусі;
- *Рыхтаваць кампетэнтных спецыялістаў,* кіраўнікоў і дзяржаўных служачых, якія будуць працаваць на карысць свайго народа;
- *Рыхтаваць пакет праектаў рэформаў* і законаў будучай свабоднай Беларусі, уключаючы амністыю для пацярпелых ад палітычна матываваных рэпрэсіяў і канцэпцыю пераходнага правасуддзя, абмяркоўваць іх з грамадствам;

- *Дэманстраваць перавагу працуючай дэмакратыі*, і паказваць, як невыкананне стандартаў правядзення дэмакратычных выбараў прыводзіць да пагаршэння жыцця людзей;
- *Фіксаваць усе парушэнні* падчас імітацыі выбараў і інфармаваць беларускую і міжнародную супольнасць.

Гэтая Платформа 2025 адкрытая для далучэння ўсіх беларускіх дэмакратычных сілаў (палітычных структураў, грамадскіх арганізацыяў і ініцыятываў, дыяспараў, суполак і інш.), якія падзяляюць яе палажэнні.

На аснове Платформы 2025 мы будзем каардынаваць сумесныя дзеянні ў 2025 годзе, на агульных сустрэчах выпрацоўваць рэакцыі на актуальную павестку, і рабіць публічныя сумесныя справаздачы па дзейнасці ў межах Платформы.

***Удзельнікі Платформы 2025***